# Фізічная мапа Беларусі









## ФІЗІКА-ГЕАГРАФІЧНЫЯ ЗВЕСТКІ ПА РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Рэспубліка размешчана ў межах 56°10′ і 51°16′ паўночнай шыраты, 23°11′ і 32°47′ усходняй даўгаты. Працягласць тэрыторыі з поўначы на поўдзень – 560 км, з захаду на ўсход – 650 км.

### РЭКІ

| Назва | Агульная даўжыня (км) | Даўжыня ў межах Беларусі (км) |
|---|---|---|
| Дняпро | 2145 | 689 |
| Зах. Дзвіна | 1020 | 328 |
| Нёман | 937 | 459 |
| Зах. Буг | 772 | 154 |
| Прыпяць | 761 | 500 |
| Сож | 648 | 493 |
| Бярэзіна (бас. Дняпра) | 613 | 613 |
| Вілія | 498 | 264 |

### АЗЁРЫ

| Назва | Плошча люстра (км²) | Максімальная глыбіня (м) |
|---|---|---|
| Нарач | 79,6 | 24,8 |
| Асвейскае | 52,8 | 7,5 |
| Чырвонае | 40,8 | 4 |
| Лукомскае | 36,7 | 11,5 |
| Дрывяты | 36,1 | 12 |
| Доўгае (Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл.) | 2,6 | 53,7 |

### РАДОВІШЧЫ КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ

- Буры вугаль
- Торф
- Нафта
- Калійныя солі
- Каменная соль
- Даламіт
- Мел і мергель
- Гліны
- Пяскі шкляныя і фармовачныя
- Пяскі будаўнічыя
- Пясчана-жвіровы матэрыял
- Будаўнічы камень
- Лячэбныя гразі
- Крыніцы мінеральных водаў

### ШКАЛА ВЫШЫНЬ У МЕТРАХ

- вышэй
- 300
- 250
- 200
- 150
- 100
- 50
- ніжэй

# НІЗІНЫ

- Нізіны- гэта паніжаныя і часцей плоскія ўчасткі раўніннай паверхні. На мапе пазначаны цёмна-зялёным колерам
- Самыя вялікія нізіны Беларусі:

Полацкая на поўначы і Палеская на поўдні




# УЗВЫШШЫ

- Узвышшы- найбольш прыўзнятыя ўчасткі паверхні раўнін. На мапе паказаны светла-карычневым колерам
- У цэнтральнай частцы Беларусі знаходзяцца ўзвышшы:
- Наваградскае, Менскае і Аршанскае







# РАЎНІНЫ

- Раўніны на мапе пазначаны светла-зялёным колерам.
- У цэнтральнай і ўсходняй частках Беларусі знаходзяцца раўніны:
- Цэнтральна-Бярэзінская і Аршанска-Магілёўская





# Карысныя выкапні на мапе




- Карысныя выкапні на мапе абазначаны спецыяльным і значкамі.

# Радовішчы карысных выкапняў

- Па запасе калійных соляў Беларусь займае чацьвёртае месца ў свеце. Найбольшае радовішча- каля Салігорска
- Каменную соль дабываюць у Мазыры. Тамз яе робяць харчовую соль
- Запасы будаўнічага пяску і гліны ёсць па ўсёй Беларусі
- Радовішчы торфу знаходзяцца на балоцістых мясцінах
- На паўднёвым усходзе каля Рэчыцы і Светлагорска ёсць радовішчы нафты
- Багата Беларусь і на падземныя і мінеральныя воды

# Ахова прыродных багаццяў





- 1. Асцярожна здабываць і перавозіць падземныя выкапні.
- 2. Неабходна эканамічна выкарыстоўваць падземныя багацці.
- 3. Клапаціцца пра аднаўленне прыродных рэсурсаў.
- 4. Замяняць падземныя багацці таннейшымі (выкарыстоўваць металалом, пластмасы і іншыя).
- 5. Сачыць за тым, каб дарма не гарэў газ у пліце. Сцерагчыся ўцечкі газу.
- 6. Не пакідаць адкрытай  уваходныя дзверы – берагчы цяпло!

# ГЛЕБЫ БЕЛАРУСІ

Глебы ў Беларусі не вельмі ўраджайныя і патрабуюць дадатковага ўгнаення.
Глебы пад хвойнымі лясамі (падзолістыя) шэрыя і амаль не выкарыстоўваюцца для сельскай гаспадаркі. Такія глебы на поўначы.
Самыя ўрадлівыя глебы пад лугамі (дзярновыя), такія сустракаюцца на ўсходзе .
Тарфяныя глебы, пад балотамі таксама самі па сабе не выкарыстоўваюцца, але торфам узбагачаюць іншыя глебы.

